Скаскевіч М.І., студ. гр. 414 а ФТБКіСМ БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Аляхновіч А.М., канд. філал. навук, прафесар

# СІМВОЛІКА РАСЛІН У БЕЛАРУСКІМ ПЕСЕННЫМ ФАЛЬКЛОРЫ

Культ расліннасці бярэ пачатак з таго перыяду, калі чалавек не вылучаў сябе з навакольнага асяроддзя і прытрымліваўся стыхійна-матэрыялістычнага тлумачэння прыроды. Трэба адзначыць, што расліны, як і жывёлы, не толькі давалі чалавеку энергію, прытулак, але яны здзіўлялі і захаплялі яго веліччу, моцнасцю, хараством, водарам лісцяў і інш. Ідэальным месцам на зямлі уяўляўся рай – сад пладовых дрэваў, які даваў чалавеку ўсё для жыцця.

У беларускай традыцыі захавалася іерархічнае ўпарадкаванне расліннага свету, паводле якога на першым месцы можна паставіць явар, як дрэва Сусвету, затым дуб – дрэва Перуна, шматлікія дрэвы з жаночымі назвамі: ліпа, бяроза, вярба, рабіна, каліна і інш. Іх паходжанне адлюстравана ў міфах, змест якіх зводзіцца да ператварэння чалавека ў расліну. Сляды асаблівага шанавання расліннасці захаваліся ў фальклоры і абрадавай дзейнасці. Нашы продкі настолькі шанавалі расліны, што ў міфах надавалі ім цудадзейную сілу, напрыклад, папараць-кветцы, вясельнаму дрэву, пералёт-траве, разрыў-траве, божаму дрэўку і інш.

Беларускі песенны фальклор прасякнуты расліннай сімволікай. Найбольш пашыраным ў ім з’яўляецца мастацкі прыём псіхалагічнага паралелізму перажывання герояў, які адпавядае стану прыродных з’яў, дзе ў якасці сімвалаў мужчынскага і жаночага пачаткаў выступаюць спецыфічныя расліны. Да гэтых жа сімвалаў па асацыяцыі і падабенству адносяцца больш складаныя раслінныя вобразныя структуры, без расшыфроўкі якіх нельга дакладна зразумець іх змястоўную глыбіню і значнасць. Вытокі гэтай сімволікі ў глыбокай старажытнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для таго, каб узнаўляць народныя абрады і традыцыі трэба дасканала разумець сутнасць беларускага фальклору, асабліва песеннага, бо ён займае значнае месца у абрадах і святах. Так, рыхтуючы свята трэба разумець сімвалічны сэнс таго ці іншага дзеяння з выкарыстаннем раслін. У кожным беларускім народным святе прысутнічаюць такія дзеянні. Напрыклад, абсыпанне аўсом вясельнага «картэжа» перад ад’ездам маладых звязана з прадуцыравальнай функцыяй аўса ў народнай сімволіцы. Пляценне руцвянога вянка для маладой тлумачыцца сімволікай руты як захавальніцы замужніх жанчын. Таму руцвяны вянок на галаве дзяўчыны сведчыў пра тое, што яна ўжо засватана. Дзявоцкія сёмушныя рытуальныя дзеянні з дрэвамі – “завіванне бярозак” звязаны з сімволікай бярозы як медыятара, а таксама жаночым пачаткам. Такім чынам, у гэтым абрадзе бяроза адлюстроўвае пераходны стан дзяўчын, гатовых да ўступлення ў шлюб.

Часам расліны ўключаліся ў абрады для перадачы пэўнай інфармацыі. Напрыклад, качан капусты ставілі на другі дзень вяселля на стол перад бацькамі “нячэснай” нявесты. Гэта тлумачыцца тым, што капуста ў беларускім фальклоры сімвалізуе стан пазашлюбнага кахання і часцей за ўсё “грахоўнага”. Таксама сродкам перадачы інфармацыі паміж хлопцам і дзяўчынай, бацькамі і замужняй дачкой служылі яблыкі. Некаторым раслінам, як, напрыклад, вярбе, маку прысвечаны адпаведныя святы (Вербніца, Макавей), якія проста немагчыма правесці, не разумеючы сімволікі дадзеных раслін.

Асноўная праблема расшыфроўкі сімволікі раслін ў песенным фальклоры заключаецца ў тым, што акрамя простых сімвалаў існуюць амбівалентныя – якія маюць падвойнае, а часам супрацьлеглае значэнне. Таму, працуючы над тэкстам песні, трэба звяртаць увагу на прысутнасць іншых сімвалаў, якія могуць поўнасцю змяняць яго сэнс. Напрыклад, вішня ў беларускім песенным фальклоры мае вялізную колькасць сімвалічных значэнняў, у залежнасці ад яе характарыстык і комплексных спалучэнняў з некаторымі з’явамі прыроды і дзеяннямі герояў. У кантэксце песень на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шлюбна-любоўную тэматыку вішняй абазначалі дзяўчыну, якая дасягнула шлюбнага ўзросту і гатовая перайсці ў наступную сацыя-біялагічную катэгорыю. Праз сімволіку вішні нярэдка выяўляецца дзявоцкая сутнасць, вербалізуецца эстэтычны ідэал дзяўчыны. Безтурботнае жыццё маладой дзяўчыны ў роднай матулі параўноўваецца з красаваннем, цвіценнем вішні ў садзе. Вішня з паламаным голлем асацыіруецца з дзяўчынай, пра якую гавораць, што яе прыгажосць не натуральная. Засыханне вішні ў садзе адпавядае выхаду нявесты са стану дзявоцкасці. Вішня-чарэмшанька, якая не родзіць ягад – гэта дзяўчына, якая не ходзіць гуляць, а ў якой корань высыхае – дзяўчына, якую мілы пакідае. Сімвалічныя карціны шчыпання вішні адпавядаюць выбару партнёра. Сумеснаная яда ягад сімвалізуе аб’яднанне людзей і часта мае шлюбна-эратычны змест. Ламанне, ссяканне дрэва, кіданне яго пад “бел шацёр” сімвалізуе сватанне да дзяўчыны. Ламанне яго ў адным садзе і перасаджванне ў другі асацыіруецца з адказам хлопцу і згодай пайсці замуж за другога. “Вішанька-чарэшанька, з-пад кораня зеляненька” – шчаслівая ў шлюбе жанчына, а “з-пад кораня да й зацята” – жанчына, якая прападае за благім мужам. Вішнёвы сад – сімвал роднай старány замужніцы. Гулянне дзяўчыны ў ім асацыіруецца з яе вольным незамужнім станам. Немагчымасць вяртання дзяўчыны да дзявоцкага жыцця ў бацькоўскім доме адпавядае немагчымасці збіраць вішні ў таткавым садзе. Кукаванне зязюлі ў вішнёвым садзе асацыіруецца з плачам ад’язджаючай нявесты з роднай хаты, ці з гараваннем маці па ад’ехаўшай дачцэ. Калі гаворыцца пра вішнёвы сад у мужавай старане, гэта звычайна звязваецца са станоўчымі эмоцыямі, выкліканымі шчаслівым жыццём.

Так, на прыкладзе шматлікіх значэнняў вішні ў песенным фальклоры, можна ўявіць наколькі разнастайнай з’яўляецца сімволіка раслін. Абсалютна відавочна, што яе расшыфроўка становіцца сапраўднай праблемай для рэжысёраў, якія імкнуцца адлюстраваць у святе нешта большае, чым проста форму. Таму рэжысёр павінен падрабязна вывучаць раслінную сімволіку і імкнуцца кампетэнтна выкарыстоўваць яе ў святе.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падсумоўваючы вышэй адзначанае, можна зрабіць наступныя высновы:

1. Веданне сімволікі раслін дапамагае рэжысёру распрацаваць цікавы сцэнарый, у якім яна раскрываецца.
2. Сімволіка раслін дапамагае рэжысёру ажыццявіць пошук вобразаў, персанажаў сцэнічных дзей у свяце.
3. Сімволіка дапамагае рэжысёру тэатралізаваць песенны матэрыял, знайсці неабходныя прыёмы акцёрскай ігры, авалодаць мімікай і пластыкай і інш.
4. Разуменне сімволікі раслін дапамагае падрыхтаваць адпаведныя дзеянню касцюмы, рэквізіт, бутафорыю і інш.
5. Вывучаючы сімволіку раслін, рэжысёр больш глыбока будзе разумець міфалагічныя вытокі абрадава-святочнай культуры.

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Гілевіч Н. С. Сімволіка // Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Мінск, 1975;
2. Каляда Г. К. Сімволіка раслін у беларускіх танцавальных песнях // Славянскія культуры: Гістарычны вопыт і сучасныя праблемы. Мн., 1996;
3. Шарая О. Ценностно-нормативная природа почитания предков. Мінск, 2002;
4. Швед І. А. Дэндралагічны код беларускага традыцыйнага фальклору. Брэст, 2004;
5. Швед І. А. Увасабленне плоднасці і дабрабыту: вобраз яблыні ў беларускім фальклоры. 2002. №9;
6. Швед І. А. Раслінныя сімвалы беларускага фальклору. Брэст, 2000;
7. Швед І. А. Бяроза ў троіцка-сёмушных святах беларусаў// Жыццём слугуючы Айчыне. Брэст, 1999.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Беларускі фальклор: Энцыклапедыя : У 2 т. : Лабараторыя традыцыйнага мастацтва – «Яшчур» / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2005–2006.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ